(памяншальныя формы ад „Валадзімер“), у прозьвішчу „Валадкевіч“, у імені „Валадзіслаў“ (правільная форма беларуская замест польскага чэхізму „Владыслав“) і інш.

Слова „ўлада“ у нас чэхізм, ужываны ўжо ў XVI ст.; мусім яго ўжываць, бо свайго слова замест яго няма. Але „Валадзімер“ увесь час было й ёсьць, дык яго й трэба ўжываць.

Зацемлю, што ў „Валадзімер“ а „Казімер“ націск на перадапошнім складзе.

# Адкрыты ліст да Сп. Волацiча

У сваім арт. „Думкі аб літаратурнай мове“ (Бацькаўшчына, № 1—2 [485—486]) Ваша, м.інш., пішаш, што „рэдактары «Сяўбіта»“ „захапляюцца сваім «наватарствам»“ (Бацькаўшчына, б. 6, канчатак артыкулу). Не належачы да рэдактароў „Сяўбіта“, я ня цікаўлюся, чым яны захапляюцца. Менаваныя, адылі, словы Вашэцевы, відавочна, трэба разумець так, што ў „Сяўбіце“ быццам было шмат благіх наватвораў; а гэтым я цікаўлюся, бо гэта датыкаецца беларускае мовы, нашага найдарожшага скарбу. Ізь зьявамі чужымі, і наагул із штучнымі благімі зьявамі ў нашай мове, трэба змагацца. Троху раблю гэта я, але, прызнаюся, з памальнымі рэзультатамі. Што іншага Ваша із сваймі ўнівэрсальнымі здольнасьцямі. Ваша лягусенька разьвязуеш цяжкія моваведныя праблемы, дагэтуль наўчонымі не разьвязаныя.

Я не прыпамінаю сабе наватвораў у „Сяўбіце“, але магчыма што я іх прагледзеў або забыўся. Дык да Вашэці просьба: падайце, калі ласка, наватворы, дагэтуль ужытыя ў „Сяўбіце“, зазначаючы, на якой бачыне кажны зь іх; зьясьнеце, чаму іх уважаеце за таковыя; пакажэце, чым яны благія і чым належыла–б іх замяніць. Спадзяюся, што „Бацькаўшчына“ не адмовіцца зьмясьціць такое патрэбнае дапаўненьне да артыкулу Вашэцевага.

З найлепшымі а найшчырэйшымі зычэньнямі *Я. Станкевіч.*

7 студзеня 1960